# ГОРАД: ЗЯЛЁНАЕ Ў МОДЗЕ

**Перспектыуныя напрамкі зялёнага горадабудаўніцтва ў краіне вызначылі на міжнародным семінары ў Мінску.**

Тэмы ўстойлівага развіцця гарадоў і ўкаранення зялёных прынцыпаў эканомікі знаходзяць адлюстраванне ў большасці нацыянальных планаў і стратэгій. У прыватнасці, у Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны да 2030 года. Аднак новыя рэаліі патрабуюць інавацыйных падыходаў да вырашэння пытанняў, звязаных з прагрэсіўнай урбанізацыяй, а таксама увязвання пытанняу аховы навакольнага асяроддзя, сацыяльнага развіцця і зялёнай эканомікі. На семінары ўдзельнікі абмеркавалі палітыку ў галіне ўстойлівага транспарту і мабільнасці, укаранення энергаэфектыўных рашэнняў. У цэнтры ўвагі ўдзельнікаў была рэалізацыя нашымі гарадамі ініцыятывы «Пагадненне мэраў па клімаце і энергіі», а таксама меры па зніжэнні выкідаў С02 пры рэалізацыі планаў зялёнага горадабудаўніцтва. Па выніках работы семінара плануецца распрацаваць прапановы па напрамках развіцця зялёнага горадабудаўніцтва ў краіне.

**Іна АЛЯКСАНДРАВА**

**Источник:** Рэспубліка. — 2017. — № 231 (7 снежня). — С. 4.